Урок беларускай мовы ў 8 класе

*Іванькова С.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры, вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Машканская сярэдняя школа імя А.К.Гараўца Сенненскага раёна”*

*Тэма*: Дапаўненне, яго граматычнае значэнне і спосабы выражэння

*Мэта*: спрыяць засваенню паняцця дапаўнення і яго агульнага граматычнага значэння; падрабязна пазнаёміць вучняў з усімі выпадкамі і спосабамі выражэння прамых і ўскосных дапаўненняў; садзейнічаць асэнсаванню вучнямі камунікатыўнай мэтазгоднасці выкарыстання сінтаксічных сродкаў мовы ў залежнасці ад задач і зместу выказвання; выпрацоўваць уменні дакладна адрозніваць дзеяча і аб’ект, на які накіравана дзеянне; вызначаць дапаўненні, выражаныя не толькі назоўнікамі, але і іншымі часцінамі мовы; развіваць лагічнае мысленне; спрыяць фарміраванню павагі да культуралагічнай каштоўнасці роднага слова

*Тып урока*: вывучэнне новага матэрыялу

*Абсталяванне*: сігнальныя карткі, карткі з заданнямі, тэстамі, кластарам

*Тэхналогія*: развіцця крытычнага мыслення

*Эпіграф*: Без дапаўненняў думка бязногая, яна не даходзіць да мэты.

Ход урока

I. *Арганізацыйны этап*

Добры дзень. Рада вітаць вас і хачу пажадаць цікавай, змястоўнай і карыснай працы на ўроку! Жадаю, каб час на ўроку не прайшоў бязмэтна, а вопыт, які вы набудзеце, прыпадняў бы ваша разіццё яшчэ на адну прыступачку.

*II. Актуалізацыя ведаў вучняў (стадыя выкліку)*

Мы працягваем працу над даданымі членамі сказа. І, каб даведацца з якім членам сказа будзем працаваць сёння, трэба ўставіць прапушчаныя літары ў словах:

Выкла_чык, прынт_р, гру(п/пп)а, с_рдэчны, а_тобус, то(н/нн)а, к_фір, ва(н/нн)а, з_ленаваты.

З атрыманых літар складзіце слова (ДАПАЎНЕННЕ).

Тэма нашага ўрока “Дапаўненне, яго граматычнае значэнне і спосабы выражэння”.

Перад вамі кластар (аркушы раздадзены парам), які мы будзем запаўняць па працягу ўрока. Зараз успомнім, што мы ведаем пра дапаўненне і запоўнім пустыя “гронкі”.

Адкажыце на пытанні:

- Дапаўненне – гэта самастойная часціна мовы або дадаены член сказа? (запісваем адказ у схему)
- Дапаўненне абазначае прымету прадмета або прадмет? (запісваем адказ у схему)
- Дапаўненне адказвае на пытанні ЯКІ? ЯКАЯ? або на пытанні ўскосных склонаў? (робім запіс)
- Запоўніце табліцу (аркушы раздадзены парам).

Табліца “Правільныя і няправільныя сцверджанні”

| Сцверджанне | Так | Не |
|---|---|---|
| Пераходныя дзясловы патрабуюць прамога дапаўнення, якое перадаецца вінавальным склонам з прыназоўнікам, родным склонам з адмоўнай часціцай НЕ, родным склонам, калі дзеянне накіравана не на ўвесь прадмет, а толькі на яго частку | | |
| Непераходныя дзеясловы патрабуюць ускоснага дапаўнення, якое перадаецца ўсімі іншымі склонамі<br>Да непераходных адносяцца зваротныя дзеясловы на -ся, -цца | | |

- *Праблемнае пытанне*: Ці можам мы падзяліць дапаўненні на групы, карыстаючыся звесткамі з табліцы? (прамое і ўскоснае)
- *Паспрабуем сфармуляваць мэты ўрока (звяртаем увагу на тэму ўрока):*

***Да канца ўрока:***

***буду ведаць, чым адрозніваецца прамое дапаўненне ад ўскоснага;***

***змагу вылучыць дапаўненні і іх віды ў тэксце;***

***буду правільна вызначаць, чым выражаецца дапаўненне.***







III. *Аперацыйна-пазнавальны этап (стадыя асэнсавання)*

Вучні самастойна чытаюць правіла на с.107-108, 109-110. Дапаўняюць кластар новымі ведамі.


ЗАЛЕЖЫЦЬ АД
ДАПАЎНЕННЕ
ВЫРАЖАЕЦЦА
Дадзены член сказа
Абазначае прадмет
Адказвае на пытанні ўскосных склонаў


дзеясловаў, дзеепрыметнікаў, дзеепрыслоўяў, назоўнікаў, прыметнікаў
ЗАЛЕЖЫЦЬ АД
ДАПАЎНЕННЕ
ВЫРАЖАЕЦЦА
Дадзены член сказа
Абазначае прадмет
Адказвае на пытанні ўскосных склонаў
назоўнікам, займеннікам, лічэбнікам, інфінітывам, прыслоўем, прыметнікам, дзеепрыметнікам, выклічнікам у значэнні назоўніка







*Самаправерка запоўненага кластара (эталон вывешваецца на дошцы)*

*Франтальная гутарка:*

- Якія дзеясловы паясняюць прамыя дапаўненні? (пераходныя)
- Якія дзеясловы паясняюць ускосныя дапаўненні? (непераходныя)

- Давайце яшчэ раз звернемся да табліцы “Правільныя і няправільныя сцверджанні”. Ці правільна вы яе запоўнілі? Калі не, назавіце памылку.

- Які сінтаксічны спосаб сувязі дапаўнення з дзеясловам-выказнікам? (кіраванне і прымыканне)

***Фізкультхвілінка*** ў форме гульні " Ці верыце вы, што…»

(На адказ «так» - устаць, калі «не» - сесці, думаючы пра сказанае настаўнікам).

1. Дапаўненне - галоўны член сказа, які абазначае прадмет маўлення і адказвае на пытанні хто? што? (не)
2. Дапаўненне - даданы член сказа, які звычайна паясняе выказнік, абазначае аб’ект або прадмет, на які накіравана дзеянне, і адказвае на пытанні ўскосных склонаў (так)
3. Існуе 2 віды дапаўнення: дапасаванае і недапасаванае (не)
4. Дапаўненне можа адказваць на пытанне ЯКІ? (не)
5. Дапаўненне можа выражацца непадзельным словазлучэннем і фразеалагізмам (так)
6. Дапаўненне можа выражацца інфінітывам (так)
7. Спосаб сувязі дапаўнення з дзеясловам-выказнікам дапасаванне (не)
8. Прамое дапаўненне адносіцца да пераходных дзеясловаў і абазначае прадмет, на які накіравана дзеянне  (так)
9. Прамое дапаўненне выражаецца назоўнікам ў вінавальным склоне з прыназоўнікам (не)
10. Прамое дапаўненне выражаецца назоўнікам ў форме роднага склону без прыназоўніка, калі пры пераходным дзеяслове ёсць адмоўная часціца НЕ (так)

*IV. Трэніровачна-карэкцыйны этап*

1.  Вызначце, якімі часцінамі мовы выражана дапаўненне ў наступных сказах. Абмяркуйце варыянты адказаў у парах. Заслухоўваюцца адказы.

1. Мама чытае **кнігу**.
2. Я кахаю **цябе**.
3. Памножыць **тры** на пяць.
4. Брат папрасіў **купіць** марозіва.

5. Вучні расказваюць **прачытанае**.

6. Сястрычка вядзе **малога** ў садок.

7. Мы верым ў светлае **заўтра**.

8. Абуджаная сэрцам дарагая пачула шчырае «**бывай!»**

9. Вучні атрымалі **тры граматы**.

10. Тарасік здагадаўся пра **ахілесаву пяту** свайго праціўніка.

2. Праца з падручнікам (практыкаванне 161, с.108). Вусна вызначаем склон дапаўнення і яго від (прамое, ускоснае).

3. Праца па варыянтах. 1 варыянт запісвае словазлучэнні з прамымі дапаўненнямі, 2 варыянт - з ускоснымі. Узаемаправерка па эталоне.

Любіць Радзіму, сніцца мне, пасадкі сасоннікаў, вырвацца на прастор, берагчы кнігу, працаваць на камп'ютары, паважаць старэйшых, шукаць ключ.

4. Дыферынцыраваныя заданні. Вучні атрымліваюць карткі з заданнямі, выконваюць адно з прапанаваных на свой выбар.

А. Запішы сказ, падкрэслі дапаўненні, вызначы іх від і спосаб выражэння.

Любіце травы, дрэвы, рэкі,
Прастор палёў, блакіт нябёс,
Цаніце Працу, Чалавека, -
І Бог вам дасць спагадны лёс. (А. Ставер)

Б. Са сказа выпішы словазлучэнні, у склад якіх уваходзіць дапаўненне. Вызначы від дапаўненняў, сінтаксічны спосаб сувязі.

Павінны мы сваім нашчадкам
Усё пакінуць, чым жылі:
І белы луг, і рэчку з кладкай,
І лес паўз жытнія палі. (В. Гардзей)

В.Запішы, паставіўшы словы, што ў дужках, у патрэбнай форме.

Вызначы від дапаўнення.

Хворы (грып), падстрэліць тры (курапатка), сустрэцца з (Васька), расказаць аб (дзед), служыў пры (кароль), хадзіць па (праспект), мала (народ), несці ў (мех), паліць (печ), гаварыць па (тэлефон), метр (шоўк).

Заслухоўваюцца адказы (на кожнае заданне – 1 адказ, калі не выбралі якое-небудзь заданне, то яно выконваецца ўсімі вучнямі разам)

5. Праца з падручнікам (практыкаванне 162, вусна)

6. Каменціраванае пісьмо (практыкаванне 164). Выпішы тыя сказы, у якіх неазначальная форма дзеяслова з'яўляецца дапаўненнем.

*V. Падагульняльна-карэкцыйны этап*

*1. Вучэбнае паведамленне па тэме ўрока на аснове кластара (слухаюцца адказы 2-х вучняў)*

2. Выкананне тэставай работы.

1.Адзначце правільны адказ. Дапаўненне — гэта…

А) галоўны член сказа, які абазначае тое, што гаворыцца аб дзейніку, і адказвае на пытанні: што робіць прадмет? што з ім робіцца? хто ён такі? што ён такое? які ён?

Б) даданы член сказа, які абазначае прадмет і адказвае на пытанні ўскосных склонаў

В) даданы член сказа, які абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? чый?

Г) даданы член сказа, які абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? чый?

2.Вызначце сказы, у якіх дапаўненне выражана займеннікам:

А) Мы прачыталі п'есу «Вечар».

Б) Стаміла яго дарога.

В) Суровы гімн пяе зямля мая.

Г) Бацька вучыў яго касіць.

3.Вызначце сказы з прамым дапаўненнем:

А) Успамінаю я апошнім часам лясы і бары.

Б) Паляўнічы часта назірае за дзікам.

В) Брат з дзяцінства цікавіўся мастацтвам.

Г) Суседка пазычыла крыху мукі.

4.Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі ў сказах словамі і іх сінтаксічнай роляй:

1. дапаўненне А) Ідуць касцы, звіняць ***іх*** косы.

2. азначэнне Б) Блакіт небасхілу ***чысты***.

3. выказнік В) Застаўшыся ў хляве, конь адразу пайшоў ***рыссю***.

4. акалічнасць Г) Сяброўка раіла мне абавязкова ***пабываць*** у Нясвіжскім замку.

5.Вызначце сказы, у якіх дапаўненне выражана прыметнікам (у значэнні назоўніка):

А) Цікавае заўсёды застанецца ў памяці.

Б) Антось выканаў заданне.

В) У лесе мы сустрэлі паляўнічага.

Г) Смелага куля не бярэ.

Д) З маленства я памятаю бабуліны казкі.

Адказы: **1**.Б; **2**.Б,Г; **3**.А,Г; **4**.1.Г, 2А, 3.Б, 4.В; **5**. В.Г.

Зрабіце самаправерку па эталоне.

- Як вы разумееце сэнс эпіграфа?

VI. *Рэфлексія.*

Зрабіць выснову па тэме ўрока, склаўшы сінквейн да аднаго са слоў: дапаўненне, урок.

| Алгарытм складання | Урок |
|---|---|
| 1. Запісаць абранае слова. | Цікавы, змястоўны |
| 2. Падабраць два прыметнікі. | Вабіць, вучыць, займае |
| 3. Падабраць тры дзеясловы. | Урок прайшоў вельмі цікава |
| 4. Скласці сказ з чатырох слоў. | Пошук |
| 5. Падабраць сінонім да слова | |

Дапаўненне

Прамое, ускоснае

Дапаўняе, залежыць, выражаецца

Від дапаўнення залежыць ад склону

Дадаены член сказа.

Заслухоўваюцца складзеныя тэксты, настаўнік аналізуе іх.

- Падыміце зялёныя карткі тыя, у каго пытанняў не засталося, чырвоныя – у каго засталіся.

YII. *Дамашняе заданне.*

Практыкаванне 166, параграф 23